УДК 378.046.4 + 811.161.3

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ПАДРЫХТОЎКІ НАСТАЎНІКАЎ ДА АРГАНІЗАЦЫІ ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” ВА ЎСТАНОВАХ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

Доўгаль А. В. (Установа адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”, кафедра тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі)

Анатацыя. У артыкуле разглядаюцца некаторыя аспекты падрыхтоўкі настаўнікаў беларускай мовы да арганізацыі даследчай дзейнасці са школьнікамі. Размяжоўваюцца паняцці даследчая дзейнасць, навукова-даследчая дзейнасць і вучэбна-даследчая дзейнасць. Раскрываецца змест работы з настаўнікамі беларускай мовы на курсах павышэння кваліфікацыі па пытаннях арганізацыі даследчай дзейнасці з вучнямі.

Даследчая дзейнасць школьнікаў у сучаснай школе з’яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў работы з адоранымі вучнямі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Яе найважнейшая задача – “ўключэнне навучэнцаў у даследчую і праектную дзейнасць, паколькі пры гэтым у іх адбываецца фарміраванне здольнасцей самастойна мысліць, аналізаваць, здабываць і прымяняць веды, прапаноўваць гіпотэзы, планаваць дзеянні, супрацоўнічаць у разнастайных па складзе групах, ажыццяўляць самааналіз і самаацэнку” [2, с. 3]. Даследчы падыход у навучанні забяспечвае вырашэнне наступных задач:

– стварэнне станоўчай матывацыі да навучання і пазнання свету;
– паглыбленне ведаў, набытых у працэсе навучання;
– фарміраванне навуковага светапогляду і знаёмства з метадамі навуковага пазнання свету;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– развіццё пазнавальнай актыўнасці і самастойнасці;
– развіццё навыкаў аналітычнага мыслення;
– развіццё індывідуальных якасцей асобы (уменне выступаць з прамовай, весці дыскусію, трымацца перад аўдыторыяй і пад.);
– выхаванне адказнасці за вынікі работы;
– выяўленне інтэлектуальна адораных вучняў;
– стварэнне адукацыйнага асяродку для развіцця асобы школьніка.

У нашай краіне штогод праводзіцца рэспубліканскі конкурс работ даследчага характару (канферэнцыя) па прадметах гуманітарнага, матэматычнага і прыродазнаўчага цыклаў. Арганізатарам і каардынатарам конкурсу з'яўляецца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Мэта конкурсу – развіццё інтэлектуальных здольнасцей вучняў, пашырэнне кола іх адукацыйных інтарэсаў, павышэнне якасці навучальнага працэсу (вытрымка з рэгламенту правядзення рэспубліканскага конкурсу работ даследчага характару). Конкурс складаецца з трох этапаў:

1 этап – раённы (гарадскі);

2 этап – абласны (асобна Мінскі гарадскі);

3 этап – рэспубліканскі.

Конкурс з'яўляецца інтэлектуальным спаборніцтвам паміж вучнямі 9-11 класаў, якія атрымліваюць агульную сярэднюю адукацыю і выканалі даследаванне па пэўным вучэбным прадмеце. Вучні могуць выконваць работу індывідуальна або калектыўна (у складзе групы з двух чалавек). Першы і другі этапы курыруюцца ўпраўленнямі адукацыі аблвыканкамаў, па выніках другога этапу яны фарміруюць састаў абласных каманд на заключны этап конкурсу. На трэцім, заключным, этапе прадстаўляюцца работы ўсіх абласцей рэспублікі, а таксама каманды г. Мінска і ўстановы адукацыі “Ліцэй БДУ”.

Неабходнай умовай для эфектыўнай даследчай дзейнасці ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца не толькі сістэмная работа са школьнікамі па развіцці навыкаў даследчай работы, але і падрыхтоўка настаўніка да арганізацыі гэтага віду працы. У прапанаваным артыкуле разглядаюцца некаторыя аспекты падрыхтоўкі педагогаў да ажыццяўлення даследчай дзейнасці школьнікаў па вучэбным прадмеце “Беларуская мова”. Матэрыялы будуць карысныя не толькі маладым і вопытным настаўнікам, але і студэнтам – будучым педагогам-філолагам.

Перадусім настаўнікі, якія ўключаны ў даследчую дзейнасць, павінны разумець сутнасць і адрозніваць на практыцы такія віды работы, як:

1) даследчая дзейнасць (= даследаванне) – мэтанакіраваная пазнанне свету, вынікі якога выступаюць у выглядзе сістэмы ведаў аб вывучаным прадмеце або з'яве;

2) навукова-даследчая дзейнасць – від пазнавальнай дзейнасці, скіраваны на пошук новых навуковых ведаў, якія адрозніваюцца аб'ектыўнасцю, значымасцю, абгрунтаванасцю, дакладнасцю;

3) вучэбна-даследчая дзейнасць – від адукацыйнай дзейнасці; форма навучання, скіраваная на фарміраванне ў вучняў даследчыцкага мыслення, навыкаў самастойнага вырашэння даследчых задач, здабывання суб'ектыўна новых ведаў.

Дыферэнцыя гэтых паняццяў дазволіць настаўніку вызначыць асаблівасці даследчай дзейнасці ў школьным асяродку. Даследчая дзейнасць вучняў – гэта перадусім вучэбная дзейнасць, мэта якой заключаецца ў набыцці навыкаў даследавання як спосабу пазнання свету, самастойны пошук ведаў, якія будуць новымі і значымымі для канкрэтнага навучэнца. Вынік даследчай дзейнасці вучня – гэта інтэлектуальны творчы прадукт, у якім пададзены факты, устаноўленыя падчас даследавання. Атрыманыя веды насамрэч могуць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

быць малакарыснымі для грамадства і самога даследчыка, яны “ўяўляюць сабой варыянт бескарыслівага пошуку ісціны” [1].

Даследчая дзейнасць вучняў выконваецца пад кіраўніцтвам настаўніка, які перадусім сам зацікаўлены у правядзенні такой работы. Ён валодае пэўнымі навуковымі ведамі, выбірае здольных для правядзення даследчай работы вучняў, прапануе тэму даследавання, плануе, арганізуе і кантролюе працэс, ацэньвае атрыманыя вынікі. Менавіта таму значную ўвагу ў арганізацыі даследчай дзейнасці ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі варта звярнуць на падрыхтоўку педагога. Гэта работа павінна ажыццяўляцца ў першую чаргу на курсах павышэння кваліфікацыі ў абласных інстытутах развіцця адукацыі, бо менавіта гэтыя ўстановы займаюцца ўдасканаленнем прафесійнага майстэрства настаўнікаў.

Цягам апошніх трох год у Магілёўскім дзяржаўным абласным інстытуце развіцця адукацыі для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры агульнаадукацыйных устаноў вобласці праводзяцца заняткі (лекцыйныя і практычныя), круглыя сталы і семінары па пытаннях арганізацыі і метадычнага суправаджэння даследчай дзейнасці школьнікаў. Адзначым ключавыя пытанні, якія асвятляюцца падчас згаданых мерапрыемстваў:

1) тэматыка даследчых работ. Звяртаецца ўвага на фармулёўку тэмы, аналізуюцца рэальныя тэмы даследчых работ (прадстаўленыя як на абласны, так і рэспубліканскі этапы конкурсу), вызначаюцца актуальныя і неактуальныя тэмы;

2) афармленне тэксту даследчай працы. Адбываецца знаёмства са структурай даследчай работы, выпрацоўка ўменняў лагічна структураваць работу, правільна называць главы і раздзелы. Настаўнікі вучацца вызначаць аб’ект і прадмет даследавання, карэктна фармуляваць мэту і задачы даследавання, авалодваюць метадычным інструментарыем даследавання. Асобная ўвага надаецца фарміраванню ўменняў фармуліраваць высновы ў адпаведнасці з пастаўленымі задачамі;

3) работа з літаратурнымі крыніцамі. Настаўнкі знаёмяцца з рознымі відамі афармлення спасылак на літаратуру (прамое цытаванне, ускоснае цытаванне, спасылка на крыніцу інфармацыі). Фарміруюцца навыкі афармлення спісу літаратуры;

4) прэзентацыя вынікаў даследавання. Праводзіцца знаёмства з патрабаваннямі да прэзентацыі вынікаў даследавання праз выкарыстанне праграмы PowerPoint. Даюцца канкрэтныя парады на зместавым напаўненні і знешнім афармленні слайдаў.

5) камунікатыўныя якасці моўцы. Праводзіцца знаёмства з такімі якасцямі маўлення, як правільнасць, лагічнасць, дакладнасць, зразумеласць, дарэчнасць, чыстата, багацце, выразнасць. Разглядаюцца асноўныя недахопы ў маўленні школьнікаў падчас публічнай абароны даследчых работ.

Мэтанакіраваная і сістэматычная праца з настаўнікамі па адзначаных кірунках, папершае, дазваляе павысіць узровень метадычнай падрыхтаванасці педагогаў, ліквідаваць “сіндром непрыняцця” даследчай дзейнасці, павысіць узровень матываванасці да яе, падругое, спрыяе паляпшэнню якасці даследчых работ вучняў, садзейнічае аднастайнасці ў афармленні, фарміруе аб’ектыўнае ўяўленне пра ацэнку школьных работ.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Літаратура

1. Маюрова, Л. В. Современные подходы к организации учебно-исследовательской деятельности школьников / Л. В. Маюрова // Молодой ученый. – 2014. – № 21. – С. 660–664. – Рэжым доступу: http://moluch.ru/archive/80/14547/. – Дата доступу: 08.02.2017.

2. От проектной и исследовательской деятельности учащихся к научно-исследовательской работе : Материалы Международной научно-практической конференции (Минск, АПО, 4–5 марта 2013 года) / под редакцией доктора педагогических наук Т. А. Лопатик. – 678 с. – Рэжым доступу: http://www.academy.edu.by/files/sborn_otmom-2014.pdf. – Дата доступу: 08.02.2017.